***Кастрыца А.А.***

# СЕМАНТЫКА АБРАДАВЫХ СТРАЎ У КАНТЭКСЦЕ ПРЫКМЕТ І ПАВЕР'ЯЎ (НА МАТЭРЫЯЛАХ ГОМЕЛЬШЧЫНЫ)

Страва – гэта і жыццёвая неабходнасць для чалавека, і пэўны сродак грамадскіх зносін, і своеасаблівая інфармацыйна-каштоўнасная адзінка традыцыйнай культуры, гэта важны атрыбут шматлікіх абрадаў і звычаяў. У тэкстах прыкмет і павер'яў, прымеркаваных да свят народнага календара, ежа (*каша* "Кашу з куцці нада скарміць курам – добра несціся будуць" (в. Прысно Веткаўскага р-на)), *хлеб* ("На І і ІІ куццю нішчым нельга адказваць. Трэба для закона хоць кусок хлеба даць" (в. Салтанава Рэчыцкага р-на)), *паска* ("Паскі пеклі і на стол клалі, на кут клалі, штоб было багатства ўсем" (в. Марс Лоеўскага р-на), *яйкі* ("Пасхальнае яйцо, которое было освещено в церкви, клали под иконы от грозы" (в. Запрудаўка Добрушскага р-на)), *семкі* ("У святыя вечары лузгалі семкі дола і плювалі на падлогу, а патом запускалі курэй для таго, штоб неслісь добра" (г. Гомель)), *бульба* ("У Каляды не дзяруць бульбу на дранікі і не пякуць. Драць нельга: каровы тады будуць адна аб адну драцца, церціся" (в. Салтанава Рэчыцкага р-на) і інш.) узгадваецца даволі часта і значэнне ёй надаецца вельмі важнае.

Звернемся да прыкладаў прыкмет і павер'яў, зафіксаваных на тэрыторыі Гомельскай вобласці. Так, *каб прадвызначыць ураджай*, гаспадары выкарыстоўвалі абрадавую кашу – ***куццю*** ("Калі *адкрываюць куццю*, глядзяць, ці іе раса. Калі іе, то *будзе багаты год*, так прыкмячалі людзі" (в. Вялікі Бор Хойніцкага р-на), ***паску*** ("Я паскай называла булку простую. Кажуць, калі *паднялася* добра, то *будзе добры ўраджай*, а як не, то дрэнны" (в. Баец Калінкавіцкага р-на).

З мэтай *паўплываць на ўраджай*, забяспечыць яго колькасць і якасць звярталіся, у тым ліку, і да абрадавага печыва – ***"жураўлікаў"*** ("На Паску *пеклі сорак жураўлікаў* і кідалі іх, каб *ураджай быў харошы*" (г. п. Лоеў), і да ***зерня*** ("На Куццю, перад Крашчэннем, каб добры ўраджай быў, па хатах хадзілі *засявальнікі* – пажылыя мужчыны. Яны *сыпалі ў хаце зерне крыжом,* з вугла ў вугал, і казалі: "Сеем, пасяваем, дабра хазяевам жалаем". Ета рабілася, каб *украпіць ураджай*" (в.

Салтанава Рэчыцкага р-на); “Каб быў добры ўраджай, у нас у карман кладуць *зерне, якое год было пад іконаю*, яго і *ў землю першым кідалі*” (в. Каплічы Калінкавіцкага р-на)), і да ***хлеба*** (“Калі лажыць *хлеб на стол без абруса*, *не будзе добрага ўраджаю*” (в. Сінічына Буда-Кашалёўскага р-на)), і нават да ***семак*** (“А штоб *радзілі гарбузы*, то той гарбуз, што на семяно аставілі, нада разбіць, і як толькі первыя шчадравікі зайдуць у хату, выбраць семкі” (в. Прысно Веткаўскага р-на)).

Варта прыгадаць таксама элементы абрадавай ежы. Напрыклад, ***шкарлупіны ад яек,*** асвечаных на Вялікдзень, набывалі магічныя функцыі асвечанага яйка, а разам з гэтым атрымлівалі цудадзейную функцыю – *уплываць на ўраджай* (“Шалуху з яек *сыпалі на агарод*, каб быў *добры ўраджай*” (в. Веляцін Хойніцкага р-на); “З пасвяцоных яец скарлупкі клалі ў мяшочак, а з вясны, перад тым як сеяць, *закапвалі ў зямлю*, каб *ураджай добры* быў” (в. Гарадок Лоеўскага р-на); “Шалупінне ад пасвяцоных яек *кідаюць у баразну*, як сеюць картошку, буракі ці моркву, каб быў *добры ўраджай*” (в. Салтанава Рэчыцкага р-на) і яго *захаванасць, чысціню* (“З пасвячоных яечак святую *шалуху закапвалі ў зелень*. Ета *ад жоту*, каб не рос на агародзе” (в. Пабядзіцель Лоеўскага р-на); “Шкарлупу ад яіц пасхальных сыпалі *ў баразну*. Тады, гаворацъ, павінна быць *картошка чыстая*” (в. Рудня Бурыцкая Лоеўскага р-на)).

Магічныя функцыі набывала таксама і асвечанае ў царкве ***сала*** (“На зажынкі, як прыйдзе на поле, бярэ сала і *мажа салам, што пасвяцілі на Пасху, серп*. Ета дзелалі, *штоб салому не елі мышы*” (в. Агародня Добрушскага р-на)).

Мы можам заўважыць, як з дапамогай добра распрацаваных магічных дзеянняў (кідання ўверх, сыпання крыжом, захавання пад іконай, асвячэння ў царкве) чалавек спрабаваў перадаць абрадавай ежы надзвычайныя якасці (святасць, чысціню, колькасць), якія у сваю чаргу з’яўляліся вызначальнымі на выніковым этапе гаспадарчай дзейнасці (багаты ўраджай, чысты гарод, добры год і інш.). Такім чынам, сакральная сіла абрадавых страў забяспечвалася выкананнем пэўных правіл паводзін чалавека-гаспадара.

Абрадавыя стравы (*куцця, аладкі, яйкі і шкарлупіны ад іх, хлеб, паска*) выкарыстоўваліся селянінам з мэтай забяспечыць ***здароўе і сытасць жывёлы*** (“На куццю, асабліва на першую, посную, калі стаўлялі *на стол гаршок з кашай*, дак

знімалі *вяршок* і клалі ў сена. Ета потым *аддавалі каровам, свінням*, *коням, курам,* штоб былі *добрыя, здаровыя*" (в. Салтанава Рэчыцкага р-на); "Калі дадзім *скарлупу* курам *з пасвечанага на Вялікдзень яйка*, то яны *не будуць хварэць*" (в. Рудня Марымонава Гомельскага р-на); "Каля форткі яйцы кладуць, каб пераступіла праз іх карова, гэта каб такая ж *гладкая ды круглая, як яйка*" (г. Добруш); "*Аладак* на Масленіцу пяклі столькі, колькі ў двары жывёлы, каб *каровы, авечкі, коні былі здаровымі*" (в. Ціхінічы Рагачоўскага р-на)), яе ***прыплод*** ("Білі *парасятко*. Да яго ашпарацьь, шэрсць абяруць. Сэрца, почкі, пячонку пасякуць, дабавяць грэчняй крупы ды ўсё ўнутр. Затым ставяць у печ. Тады, як *згатуецца*, нясуць *у цэркаў, свецяць*, *каб свінні вадзіліся*"( г. п. Акцябрскі)), ***захаванасць*** ("Курам, карове неслі *верх куцці,* штоб куры *не разбягаліся*, кучкай хадзілі" (в. Белы Калодзеж Лоеўскага р-на); *"Гушчу з багатай куцці* гаспадыня аддавала курам. Клала гушчу *ў абруч с бочкі.* Калі дамашнія куры, качкі, гусі з'ядзяць гушчу з гэтага абруча, то *будуць яйкі несці добра і толькі ў сваім двар*э" (в. Веляцін Хойніцкага р-на); "На Юр'я пад варотніцу *яйкі* клалі і ніткі, *каб карова прыходзіла дадому*" (в. Вялікі Бор Хойніцкага р-на); "На Юр'я вербачку свечаную бралі, *булку хлеба* абматавалі белым палаценцам і выганялі на поле скаціну. *Хлеб бяруць затым, каб скаціна панімала свой двор*, на чужых дварах не хадзіла" (в. Кругавец Добрушскага р-на ад Кабанчук С. М.)) і ***карыснасць у гаспадарцы*** ("*...што аставалася (ад куцці)* , тое і аддавалі ўсё ўмесце курам, *каб несліся*" (в. Калініна Гомельскага р-на); "У нядзелю раніцай , як прыходзілі з цэрквы, не захадзя ў дом, *неслі свяцоную паску даць кароўцы*, каб *добра давала малако*" (в. Салтанава Рэчыцкага р-на); "*Шкарлупу з яйка пасвечанага* курам аддавалі, *каб куры несліся*" (в. Страдубка Лоеўскага р-на); "На другі дзень (14 студзеня), уранні, часоў у сем-восем, *дзеці ішлі засяваць*. А эта *зярно* хазяйка не ўбірае да вечара. *Вечарам* яна *вымятае* і дае *курам, штоб харашо неслісь*" (в. Знамя Добрушскага р-на). Магічная сіла ўзгаданых у прыкладах страў засноўвалася на пэўным комплексе якасных прадметных характарыстык, якія з'яўляліся вызначальнымі на пэўным этапе іх выкарыстання: "святое" яйка забяспечвала абарону ад шкоднага ўздзеяння, хлеб (як сімвал дому) – вяртанне ў "свой двор", форма кола ("абора", "абруч з бочкі" і да т.п.), у якім ляжала абрадавая страва, сімвалізавала межы "сваёй" прасторы, вялікая колькасць ежы (аладак, зерня і інш.) –

вялікую колькасць асобін, “гладкасць” і “кругласць” яйка надавала такія ж якасці жывёле. вяршок (верх як сімвал дабрабыту, плоднасці, жыццёвай сілы) ад куцці абяцаў здароўе і прыплод жывёлы. Дарэчы, “здольнасць кашы пры варцы павялічвацца ў аб’ёме, “расці”, матывавала такія яе значэнні, як пажаданне хуткага росту, памнажэння і развіцця, галоўным чнам, у абрадах радзіннага цыкла, а таксама ў жывёлагадоўчых абрадах”[4, с.484].

*Прагназаванне добрага здароўя і шчаслівага лёсу чалавека, спрыянне багаццю і дабрабыту сям’і* здзяйснялася пры дапамозе абрадавага печыва – ***“жаўрукоў”*** (“Пасля Мясаеду, перад постам, гэта значыць на масленным тыдні “гукалі вясну”. У вялікіх сем’ях *выпякалі жаўрукоў* і ў адзін пернік *лажылі капейку*. *Хто знойдзе*, той *будзе багаты, шчаслівы*” (в. Краснае Гомельскага р-на)), “***галак”*** (“На Саракі абавязкова *пякуць галкі* – 40 штук, але калі сям’я невялікая, то меней. У адну з іх *кладуць капейку*. Каму такая галка дастанецца, таму *будзе вельмі шанцаваць*, ён будзе ўсё знаходзіць” (в. Вуглы Рагачоўскага р-на)), ***“балабушак***” (“Саракі былі дваццаць другога марта. На той дзень *пяклі пцічак любых, балабушкі*. У якую-небудзь з іх *клалі капейку. Хто найдзе, той будзе шчаслівы*” (в. Калініна Гомельскага р-на)), ***пасак*** (“Калі *загадаеш якое-небудзь жаданне* і *з’ясі 12 пасак*, то яно абавязкова *збудзецца*” (в. Рудня Марымонава Гомельскага р-на); “Існавла павер’е, што калі *лопне чыя пасха*, дык для гэтага чалавека *будзе няўдачны год*” (в. Крукавічы Калінкавіцкага р-на); “Еслі *адкусіў пасвечаную паску і не папярхнуўся – будзе жыць*” (в. Белы Калодзеж Лоеўскага р-на)), ***“хрэшчыкаў”*** (“Вясну гукалі шостага мая. У гэты дзень *выпякалі “хрэшчыкі”*, імі *можна было вылечвацца ад хвароб*” (в. Глыбаўка Веткаўскага р-на)), гэта значыць усяго таго, што мела дачыненне да свайго дому, да рук гаспадыні. Зразумела, што дадатковая семантыка багацця і шанцавання надавалася печыву, у якое хавалі капейку, а апатрапеічная – печыву ў выглядзе хрысціянскай сімволікі, “хрэшчыкаў”. У гэтай сувязі варта прыгадаць словы даследчыка С. Няклюдава: “Праз нейкую сімвалічную прымету, выражаецца пэўная міфалагічная ідэя, дадзеная прымета прыпісваецца ўсяму, што па свайму функцыянальна-семантычнаму складу з гэтай ідэяй звязана” [3, с.28-29].

*Ахова* ад шкоднага ўздзеяння нядобрых людзей і некаторых з'яў навакольнага асяроддзя была неабходнай умовай добрага жыцця. У якасці сродкаў для абароны і абясшкоджання ад злых сіл выкарыстоўваліся такія абрадавыя стравы, як

- ***куцця*** (*"Галку з куцці* аддавалі *сабаку*, каб *усё адражалася на сабаку*" (п. Яўстраткаўка Гомельскага р-на); "Сядаючы за стол, *хазяйка брала куццю*, выходзіла за парог і казала: "Мароз, мароз, хадзі кашу есці." Эта для таго, *каб мароз не памарозіў пасевы*" (в. Гусявіца Буда-Кашалёўскага р-на);

- ***хлеб*** ("*Хлеб,* што даюць шчадроўшчыкам, *чарадзейны.* Яго даюць людзям, жывёле *ад злога вока і ад хвароб"* (в. Агародня-Кузмінічская Добрушскага р-на); "У нас, звычайна, *засцерагалі худобу ад дрэннага глазу* вот як: перад выганам *давалі карове спечаную булку хлеба*, якую тры разы васьмёркай праносілі па-над сталом. І карова цэлы год давала добрае малако" (в. Сівінка Веткаўскага р-на); *"Ад граду* хлеб лапатай садзілі ў печ"(в. Страдубка Лоеўскага р-на)); "*Хлеб***,** што даюць шчадроўшчыкам, *чарадзейны.* Яго даюць людзям, жывёле *ад злога вока і ад хвароб*" (в. Агародня-Кузмінічская Добрушскага р-на).

Да хлеба ў народзе заўсёды адносіліся з павагай і пашанай, ён з'яўляўся не толькі гарантам існавання і сімвалам самога жыцця, але і своеасаблівым паказчыкам дабра і зла, станоўчага і адмоўнага ў жыцці чалавека ("Калі *булку хлеба кінулі ў ваду*, *то патопіцца радня*" (в. Старая Лутава Лоеўскага р-на); "*Нельга класці* хлеб *скарынкай уніз*, бо *ў хаце будзе непарадак*" (в. Востраў Рагачоўскага р-на); "Калі не даеш кусок хлеба*, будуць сніцца старцы*", "Хто *кіне хлеб* на зямлю*, будзе няшчасны*", "Калі *хлеб упаў на пол*, у дом скора *прыйдзе злы чалавек*" (в. Сінічына Буда-Кашалёўскага р-на)). Як сведчаць прыклады павер'яў, хлеб нельга было "крыўдзіць": кідаць, класці скарынкай ўніз, таму што гэта правакавала непрыемнасці і няшчасці (тут выразна прасочваецца сімволіка нізу, з яго прыметамі дрэннага, смяротнага).

- ***паска*** ("Ад *ведзьмаў пасху замачвалі* ў вадзічку, накрывалі крышкай, і стаяла гэта амаль цэлы год" (в. Гарадок Лоеўскага р-на); "*Паску ўпрыгожвалі крастом* і *ў сярэдзіну* саджалі *свячоную свечку*, якую палілі за сталом *ад злых духаў*" (в. Каплічы Калінкавіцкага р-на)). Магічнай сілай гэтае абрадавае печыва

надзялялася пры спалучэнні з пэўнымі сімвалічнымі адзінкамі хрысціянства – асвечанай вадой, крыжом, свечкамі, а гэта значыць, што, паводле народных вераванняў, ад уздзеяння адных звышнатуральных сіл (злых, адмоўных) маглі выратаваць толькі другія звышнатуральныя сілы (добрыя, станоўчыя).

- ***яйка*** (“Еслі *быў пажар*, з *пасхальным яйцом абыходзілі* хату, каб другія не загарэліся” (в. Судкоў Лоеўскага р-на); “*Яйка* закопвалі *пад парог*, гдзе праходзіла карова, *штоб ведзьма не атабрала малако* ў каровы” (в. Усохская-Буда Добрушскага р-на); “А на Юрыя са ўсім пачотам адпраўлялі кароўку на поле. *Пад парог* хлява *закапывалі абыкнавенныя яйкі*, *штоб аніякая нячыстая сіла не павадзілася к кароўкі нашай*” (в. Старое Сяло Веткаўскага р-на). Напэўна, семантыка пасхальнага яйка, якое з’яўляецца “эмблемай бессмяротнасці [2, с. 597], абумовіла яго ўжыванне ў якасці прадмета, што абараняе ад смерці, бедстваў і нячыстай сілы.

*Прадказанне надвор’я* (“Во што дзелалі: вот бывала матка *напячэ птушачак*, а тады пячэ яшчэ атдзельна, *адкладае марозоў*: сколькі марозаў атышло, столькі і адкладае: адшчытаюць тых галачак, а тады *шчытаюць* сколькі асталося – *сколькі яшчэ будзе марозаў”* (в. Данілавічы Веткаўскага р-на)), *забеспячэнне цёплых дзён* адбывалася таксама пры дапамозе абрадавых страў, у прыватнасці, ***бліноў*** (“Каб *сонца паварачывала на лета*, каб *добра грэла*, трэба было яго ўблажаць, шанаваць, славіць *прыгатаўленнем круглых*, як сонца, масленых *бліноў*” (в. Рудня Марымонава Гомельскага р-на); “Пасля Мясаеду ...елі бліны, першы *блін кідалі ўгору*, каб хутчэй прыляталі *і вясну зазывалі*” (в. Краснае Гомельскага р-на)), якія з’яўляліся “ўвасабленнем сонца і далучэннем да яго жыватворнай моцы” [1, с. 47].

“Узаемаадносіны” з продкамі – важны момант традыцыйнай этыкі беларусаў, а ўшанаванне душ продкаў – важная умова шчасця і дабрабыту сям’і. Менавіта таму на розныя святы у знак памяці і павагі пакідалі ім ежу: “*Астатак куцці* астаўлялі на стале і другую яду – *для дзядоў*. Яны тожа прыходзілі есці, калі ўсе лажыліся аддыхаць” (в. Пабядзіцель Лоеўскага р-на); “*Куццю ставяць пад іконамі*. Міскі, з якіх елі, не мыюць. Іх пакідаюць на стале, *каб дзядам було ў чым есці*” (в. Каплічы Калінкавіцкага р-на); “*На Дзяды* гатавалі *многа разнай яды*, а яшчэ гатавалі *тую яду, якую любіў памёршы*” (Рудня-Бурыцкая Лоеўскага р-на). На думку М.М.

Валянцовай, "як архаічная і сакральная страва (з "прыроднага", амаль неапрацаванага прадукта – цэльнага зерня) каша з'яўлялася абавязковым частаваннем іншасветных персанажаў з мэтай іх задобрывання ("кармленне" душ памерлых, частаванне дамавога, ахвяраванне хваробам)" [4, с.484].

Прымета колькасці (множналікавасці) абрадавых страў з'яўляецца станоўчай для гаспадаркі, таму што сімвалізуе багацце, заможнасць (тут выразна прасочваюца элементы магіі падабенства): "Кожная гаспадыня імкнулася нагатаваць да Шчодрага вечара *як мага больш страў*, таму што ў залежнасці ад таго, як чалавек праводзе стары год і сустрэне новы, *такім для яго будзе ўвесь надыходзячы год*" (в. Палессе Чачэрскага р-на); "На стале *павінна было быць многа яды*, ёсць такая прыкмета, калі на стале многа ўгашчэнняў, тады *год буде багаты*, *жывёла будзе здаровая і прывядзе многа прыплоду*, крэпкага і здаровага" (в. Рудня Марымонава Гомельскага р-на); "Існавала прыкмета, што калі *харошы стол на Тройцу*, то будзе хватаць усяго, *увесь год добра будзеш жыць*" (в. Вуглы Рагачоўскага р-на)

Прааналізаваўшы прыкметы і павер'і, можна сцвярджаць, што ў выкарыстанні абрадавых страў, згодна з функцыянальна-семантычным прызначэннем, умоўна можна выдзеліць некалькі груп: 1) прагназаванне і забеспячэнне добрага ўраджаю; 2) захаванне і памнажэнне свойскай жывёлы; 3) спрыянне багаццю і дабрабыту сям'і; 4) спрыянне шчасліваму лёсу і добраму здароўю; 5) ахова ад шкоднага ўздзеяння нядобрых людзей і некаторых з'яў навакольнага асяроддзя; 6)"наладжванне кантакту" з душамі продкаў; 7) спрыянне надыходу вясны, забеспячэнне добрага надвор'я.

**ЛІТАРАТУРА**

1. Беларуская міфалогія: Энцыклапедычны слоўнік / С. Санько, Т. Валодзіна, У. Васілевіч і інш. – Мінск: Беларусь, 2004. – 592 с.

2.Керлот, Хуан Эдуардо. Словарь символов / Хуан Эдуардо Керлот. – М.: «REFL-book», 1994. – 608 с.

3. Признаковое пространство культуры / Отв. редактор С.М. Толстая. – М.: Индрик, 2002. – 432 с.

4. Славянские древности: этнолингвистический словарь: В 5 т. / Под общ. ред. Н. И. Толстого. – Т. 2. – М.: Международные отношения, 1999. – 704с.

Выкарыстаны матэрыял фальклорнага архіва кафедры беларускай культуры і фальклварыстыкі ГДУ імя Ф. Скарыны